**УДК 168.522**

# АСІМЕТРЫЧНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ Ў КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫМ ДАСЛЕДАВАННІ, ЦІ ЭФЕКТ ПЕРАГОРНУТАГА ЧАСУ

***канд. філал. навук, дац. культуралогіі С.М. САРОКА***
***(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Мінск)***

*Разглядаецца праблематыка з'яўлення сіметрычнай і асіметрычнай інфармацыі ў культуралагічным даследаванні; вызначаюцца асноўныя паказчыкі і характарыстыкі абстрактных інфармацыйных сістэм культуры. У артыкуле ўпершыню ўводзіцца і абгрунтоўваецца паняцце «эфект перагорнутага часу» як жорстка дэтэрмінаваныя сучаснасцю інфармацыйныя працэсы мінулага, перанесеныя з адной абстрактнай інфармацыйнай сістэмы ў іншую. Праводзіцца ідэя, што з'яўленне асіметрычнай інфармацыі адбываецца менавіта на падставе інфармацыйнай прычыннасці, злучана з прастора-часавай разарванасцю інфармацыйных працэсаў. Інфармацыйны аналіз праводзіцца на прыкладзе беларускай культуры XIX стагоддзя як інфармацыйнай сістэмы. Тлумачыцца магчымасць і ўмовы разгляду розных інфармацыйных сістэм культуры ў межах больш складанай, якой быў, напрыклад, Паўночна-Заходні край поліэтнічнай дзяржавы Расійскай імперыі.*

**Уводзіны.** Пры інфармацыйным падыходзе разглядаць соцыум ці культуру трэба праз абстрактныя інфармацыйныя сістэмы (ІС). Яны адрозніваюцца ад звычайных тэхнічных ІС тым, што з'яўляюцца навукова-тэарэтычнымі канструктамі, якія існуюць у віртуальнай прасторы навуковых тэорый і залежаць ад пэўнай метадалогіі іх пабудовы. У той жа час віртуальная прастора і абстрактныя ІС рэальна ўздзейнічаюць на наша штодзённае жыццё, што абумоўлена інфармацыйнай прычыннасцю і прынцыпам ізафункцыялізму самой інфармацыі. Праблематыкай абгрунтавання і тлумачэння парадыгмы функцыялізму, інфармацыйнай прычыннасці, інфармацыйнага падыходу ў навуковых даследаваннях займаліся Х.У. Пантэм, Д.І. Дуброўскі, Л.В. Ляскоў, К.К. Колін, І.І. Юзвішын, Ю.А. Шрэйдар, І.В. Мелік-Гайказян і інш.

Мэта нашага даследавання – абгрунтаванне паняцця «эфект перагорнутага часу» на падставе інфармацыйных працэсаў, праз даследаванне інфармацыйнай прасторы (ІП) беларускай культуры XIX стагоддзя як абстрактнай самаарганізаванай ІС, якая функцыянавала ў ІП Паўночна-Заходняга краю Расійскай імперыі.

**Асноўная частка.** Інфармацыйная сістэма соцыуму/культуры ўяўляе сабой сістэму збірання, захавання, пераапрацоўкі і тыражыравання інфармацыі, мае адпаведныя рэсурсы і тэхналогіі. Асноўная функцыя кожнай ІП такой сістэмы – забеспячэнне доступу да інфармацыйных рэсурсаў як разнастайнай жыццёва неабходнай інфармацыі праз каналы камунікацыі, а таксама стварэнне спрыяльных умоў для яе выкарыстання. У рэчаіснасці грамадскай дзейнасці гэтая функцыя выконваецца праз сістэму кіравання сацыякультурнымі інфармацыйнымі працэсамі, што дазваляе разглядаць як адзінае цэлае інфармацыйную, камунікацыйную і кіруючую ці кібернетычную сістэмы менавіта на падставе інфармацыйнай прычыннасці. Прычым, у дынаміцы сістэмы, а яна разглядаецца як працэс, акрэсліваецца сама структура ІП.

Інфармацыйная прастора заўжды латэнтна абмежаваная, але ўмоўна яе можна праектаваць на першапачаткова вызначаныя прастора-часавыя паказчыкі аб'екта даследавання: геаграфічнае размяшчэнне, напрыклад, адміністрацыйнай адзінкі і гістарычны перыяд яе існавання. У складзе Расійскай імперыі пад Заходнім краем, ці Заходняй Расіяй, у XIX стагоддзі разумеліся польскія землі, што адышлі да яе пасля трох падзелаў Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795 гг.). Заходні край яднаў Паўночна-Заходні край, які ўключаў шэсць губерняў: Віленскую, Ковенскую, Гродзенскую, Мінскую, Віцебскую і Магілёўскую; і Паўднёва-Заходні край, куды ўваходзілі тры губерні: Валынская, Падольская і Кіеўская. На рубяжы XVIII – XIX стагоддзяў ІП краю была неаднароднай культурнай, сацыяльнай, рэлігійнай, моўнай ІП пагранічнага рэгіёну, з'яўлялася структурным новаўтварэннем для ІС Расійскай імперыі і не адпавядала яе культурным традыцыям. Гэтая шматузроўневая ІП патрабавала русіфікацыі, што ў межах адзінай дзяржавы было жыццёва неабходным для стварэння бесперапынных інфармацыйна-камунікатыўных зносін на розных узроўнях, а перш за ўсё кіраўніцкім і адукацыйным. Афіцыйныя інфармацыйныя патокі, якія пачалі распаўсюджвацца па тэрыторыі краю, амаль да паловы XIX стагоддзя адносяцца да працэсаў гетэракаталізу (звонку).

Як сцвярджаюць сучасныя польскія гісторыкі, тры магутныя дзяржавы – Аўстрыя, Прусія і Расія – абгрунтавалі падзел Рэчы Паспалітай 1772 года сваімі «гістарычнымі правамі» на захопленыя землі і «разбэшчваннем польскай дзяржавы» [1, с. 151]. З пункту гледжання інфармацыйнага падыходу гэтая «разбэшчанасць» – адсутнасць магчымасці наладзіць інфармацыйныя працэсы аўтакаталізу (унутраныя), якія спрыяюць функцыянаванню ІС, стварэнню адзінага культурнага інфармацыйнага ўзроўню як натуральнага паразумення паміж людзьмі на той час, у прыватнасці паміж каталікамі і праваслаўнымі. На

думку беларускага гісторыка П.Г. Чыгрынава, з уваходжаннем у склад Расійскай імперыі была вырашана адна з галоўных праблем праваслаўнага беларускага насельніцтва – пакладзены канец мэтанакіраванаму, актыўнаму і прымусоваму распаўсюджванню каталіцызму і паланізацыі, спынена пагроза дэнацыяналізацыі беларускага народа [2, с. 191].

Аналізуючы пытанне эфектыўнай колькасці грамадскай інфармацыі, Н. Вінер адзначыў як адзін з самых дзівосных фактаў жыцця кожнай дзяржавы тое, што ў ёй вельмі мала гомеастатычных працэсаў[1], якія эфектыўна дзейнічаюць. Між тым менавіта на іх павінны быць скіраваныя дзяржаўныя інтарэсы і ўнутраная палітыка, у тым ліку і на этычным узроўні. Вінер тлумачыў: «Невялікія, цесна спаяныя суполкі маюць высокую ступень гамеастазу, будуць гэта культурныя згуртаванні ў цывілізацыйнай краіне ці пасяленні першабытных дзікуноў. Якімі б дзіўнымі і нават агіднымі не здаваліся нам звычаі многіх варварскіх плямёнаў, гэтыя звычаі ўвогуле маюць цалкам акрэсленую гомеастатычную каштоўнасць» [3, с. 198]. Адзначым, што ў Паўночна-Заходнім краі беларуская супольнасць мела высокую ступень гамеастазу ў параўнанні з польскай ці рускай, гэтае ж тычыцца яўрэйскіх, татарскіх і іншых «малых груп», якія прыстасаваліся да жыцця ў паграніччы і захавалі першародныя культурныя вытокі.

Інфармацыйнымі рэсурсамі разглядаемага часу існавання ІП соцыуму могуць быць толькі першакрыніцы, якія атрымалі ў ёй распаўсюджванне і захаваліся сёння ў якасці каштоўнай *фундаментальнай інфармацыі* ў архівах і бібліятэках. Гэта значыць, што першакрыніцы прайшлі апрабаванне часам, з'яўляюцца падмуркам для далейшага разгортвання інфармацыйных працэсаў, на іх грунтуюцца навуковыя даследаванні. У той жа час яны сёння даступныя кожнаму, аказваюць, як і раней уплыў на фарміраванне сучаснай ІП беларускай культуры і яе няспынную дынаміку.

Інфармацыя, якая сустракаецца ў навуковых даследаваннях, кнігах ці іншых інфармацыйных крыніцах пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года, адпавядае часавым паказчыкам іншай ІП і не з'яўляецца інфармацыйным рэсурсам непасрэдна вызначанага намі часу існавання аб'екта даследавання (ІП беларускай культуры ХІХ ст.). Але адзначым, што дадзеная інфармацыя (яе трэба лічыць другаснай, апрацаванай, дапаможнай інфармацыяй) можа цалкам адпавядаць рэчаіснасці, фактам і падзеям гістарычнага мінулага – гэта значыць быць верыфікаванай ці *сіметрычнай інфармацыяй*; а можа быць і фрагментарнай ці асіметрычнай, незразумелай нам ці трансфармаванай пад уплывам розных характарыстык адпаведнага часу сваёй ІС. Фундаментальная інфармацыя, у параўнанні з дапаможнай, для даследчыка заўжды будзе мець большую каштоўнасць у працэсе генерацыі інфармацыі.

*Асіметрычная інфармацыя* – гэта інфармацыя, якая пры верыфікацыі не пацвярджаецца літаральна, не з'яўляецца ўвогуле адэкватнай пры параўнанні яе з першакрыніцамі. Яна не абавязкова павінна быць наўмысна скажонай даследчыкамі, бо асіметрычнасць інфармацыі – з'ява дынамікі (разгортвання ў часе) яе шматлікіх форм у ІП той ці іншай ІС. Інфармацыйная асіметрыя як *інфармацыйная несуадноснасць* можа фарміравацца натуральна на памежжы розных інфармацыйных узроўняў, у тым ліку навуковых, пры пэўных абставінах задавальняць па інфармацыйна-культурных паказчыках часовае культурна-каштоўнаснае поле ІС. Дапаможная, ці другасная інфармацыя складае суб'ектыўны тэзаўрус ІП даследчыка(ў), можа быць карыснай для дадзенага аналізу, які таксама мае суб'ектыўныя рысы. Інфармацыйная асіметрыя намі вызначаецца практычна ў ходзе зваротнай (кібернетычнай) сувязі пры верыфікацыі паведамленняў як інфармацыйная несуадноснасць рэпрэзентанта – інтэрпрэтанту. Растлумачым гэта на прыкладзе.

У сучаснай ІП беларускай культуры часта назіраецца атаясамліванне геаграфічнай прасторы і *ІП Паўночна-Заходняга краю* імперыі з «Белоруссией» ці з *ІП беларускай культуры* ХІХ стагоддзя. Гэта відавочная інфармацыйная асіметрыя, якая ўзнікае ў выніку ігнаравання даследчыкамі, па-першае, асаблівасцей прасторава-часавай дынамікі інфармацыйных працэсаў, а па-другое, нелінейнага і неабарачальнага характару працэсаў эвалюцыі самаарганізаванай сістэмы, якой з'яўляецца беларуская культура.

Інфармацыйная прычыннасць дадзенай з'явы трымаецца на «*эфекце перагорнутага часу*». Яго сутнасць непасрэдна звязана са зваротнымі (як бы перагорнутымі) працэсамі адлюстравання ў свядомасці сучаснага чалавека гістарычных падзей, калі мінулае ўспрымаецца як жорстка дэтэрмінаваныя сучаснасцю ментальныя інфармацыйныя працэсы, а сучасныя веды – як даступная і зразумелая чалавеку мінулых стагоддзяў інфармацыя. Насамрэч гэта памылковая ўстаноўка свядомасці, якая будуецца на ідэалізаваных інфармацыйных працэсах і патоках, на перабольшванні ўласцівасцей абстрагаваных канструктаў па-за прасторай і часам пэўнай ІС. Дадзеная ўстаноўка дазваляе асэнсоўваць сучаснасць і мінулае ў адзінай інфармацыйна-культурнай прасторы і адзінай ІС, але трэба ўлічваць, што асіметрыю выклікае менавіта *прастора-часавая разарванасць*.

Напрыклад, існаванне сучаснай дзяржавы Беларусі, а таксама яе геаграфічная тэрыторыя, яе ІП (уключае і рэфлексію падзей мінулага) могуць успрымацца даследчыкамі гістарычных працэсаў статычна як пазачасавая дадзенасць. Менавіта сучаснасць можа асэнсоўвацца людзьмі як ідэал ці ідэя, да якой

[1] Гомеастатычны працэс – працэс самарэгуляцыі ўнутранага стану адкрытай сістэмы, які скіраваны на падтрымку ці аднаўленне раўнавагі.

стагоддзямі беларусы павінны былі імкнуцца, а не ў дынаміцы разгортвання шматлікіх інфармацыйных патокаў у розных неабарачальных ІС. Падставай да з'яўлення падобнай асіметрыі сярод іншых прычын можна назваць тое, што тэрыторыя сучаснай Беларусі амаль супадае з асноўнай часткай былога Паўночна-Заходняга краю[2]. Выключэнне складаюць цэнтральныя і паўночна-заходнія віленскія землі (сучасныя літоўскія землі), паўночна-ўсходнія віцебскія землі (сучасныя латвійскія і рускія землі) і некаторыя іншыя тэрыторыі.

Заўважым, што пры інфармацыйным падыходзе атаясамліванне ІП сучаснай Беларусі з ІП Паўночна-Заходняга краю Расійскай імперыі не магчыма па шэрагу прычын, асноўныя з якіх:

1) несупадзенне гістарычных эпох, кожная з якіх мае свае адметныя каштоўныя характарыстыкі ІП;
2) існаванне розных дзяржаўных утварэнняў, ад межаў і прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі (эліты) якіх залежыла кіраванне інфармацыйнымі працэсамі ў ІС соцыума;
3) наяўнасць розных структур і мэт функцыянавання ІС.

Без уліку вышэйназваных фактараў разглядаць ІП беларускай культуры ў кантэксце сусветнай культуры нельга, бо ў адваротным выпадку яна будзе мець толькі абстрагаваны і ідэалізаваны выгляд, што характэрна для свядомай міфатворчасці і не адпавядае навуковым запатрабаванням інфармацыйнай эпохі.

Да 1863 года на тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю не было адзінага кіруючага цэнтра[3], што сведчыць аб праблемах цэнтралізацыі і рэгулявання інфармацыйнымі працэсамі. Тут існавалі як адносна незалежныя адна ад адной пяць губернскіх цэнтраў: Магілёў, Віцебск, Мінск, Гродна і Вільня; яны аб'ядноўваліся ў тры генерал-губернатарствы: Беларускае, Мінскае і Літоўскае. Лакалізаваная дзейнасць генерал-губернатараў і ўзмацненне ролі губернскіх праўленняў выклікалі ў соцыумах гомеастатычныя працэсы. Аднак увогуле пераважалі дысіпатыўныя працэсы, а ролю атрактараў пры фарміраванні новых структур у выніку самаарганізацыі ІС краю выконвалі непасрэдна ўласныя назвы «Белоруссія» і «Литва». Адметнасць існавання ІП Паўночна-Заходняга краю як самастойнага структурнага ўтварэння ў ІС Расійскай імперыі пацвярджаюць адваротныя агульнаімперскім тэндэнцыі: інфармацыйныя працэсы аўтакаталізу ў межах Расійскай імперыі адпавядалі працэсам гетэракаталізу ў ІС Паўночна-Заходняга краю і наадварот.

У інфармацыйнай прасторы краю XIX стагоддзя тэрыторыя, на якой змешчана сучасная Беларусь, цалкам не атаясамлівалася з «Белоруссіей», хоць у дынаміцы фарміравання ІП беларускай культуры гэтая тэндэнцыя, безумоўна, набірала моц. У дадзены момант для нас значна тое, што разглядаць спрэчную культурную ідэнтыфікацыю жыхароў пагранічных зон па-за прасторава-часавымі межамі ці без удакладнення пэўнага гістарычнага прамежку часу, без уліку непасрэднай дзяржаўнай прыналежнасці нельга. Няўстойлівасць і неабарачальнасць ІС культуры правакуе спрэчныя пытанні, асіметрыя можа трымацца як на пераасэнсаванні гістарычных звестак, так і на сучасных рэальных падзеях, на матэрыяльных і духоўных каштоўнасных імкненнях людзей. Пры гэтым галоўнай у неўраўнаважанай ІС соцыуму заўжды будзе «страла часу» (тэрмін А.С. Эдынгтона), якая ў ІП беларускай культуры непасрэдна звязана з «беларускай ідэяй».

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 годзе пад «Белоруссіей» меўся на ўвазе рэгіён, які аб'ядноўваў частку далучаных да Расійскай імперыі зямель так званай Рускай Польшчы і частку ўласных (на сучасны погляд) рускіх зямель. Тапонім «Белоруссія» распаўсюджваўся на полацкія землі, аднак беларускімі лічыліся акрамя полацкіх і магілёўскіх зямель, часткова наўгародскія, пскоўскія і смаленскія землі, што было непасрэдна звязана з фарміраваннем адзінай ІП [4]. У адміністрацыйна-гаспадарчай сістэме «Белоруссіі» назіраліся ў канцы XVIII стагоддзя паскораныя трансфармацыі і рух усходняга адраджэння, ІС соцыуму была цалкам скіраваная на ўсход. Улады спрабавалі аднавіць былую стратэгічную і геапалітычную значнасць некалі магутнага горада Полацка як буйнога славянскага культурнага і гістарычнага цэнтра. Пра гэта сведчыць захаваная ў архівах інфармацыя па дзейнасці канцылярый і само існаванне Полацкага намесніцтва (1772 – 1776), Полацкай губерні (1776 – 1796) з цэнтрам у г. Полацку.

У інфармацыйнай прасторы краю імперыі першай паловы XIX стагоддзя да «Белоруссіи» адносілі выключна полацкія, віцебскія і магілёўскія землі. Яны афіцыйна складалі адміністрацыйную адзінку – «Белорусскую губернію» – сем гадоў (1796 – 1802), былі аб'яднаныя ў Беларускую навучальную акругу (1829 – 1850). Значная частка сучаснай тэрыторыі Беларусі адносілася да літоўскіх зямель. Літоўская губерня ў 1796 – 1802 гадах – гэта віленскія і слонімскія, уключаючы гродзенскія, ковенскія, брэсцкія і іншыя землі, з цэнтрам у г. Вільні. Уласныя назвы «літоўскія» і «беларускія» былі ва ўжытку ў ІП краю значны час і пасля афіцыйнай змены назваў губерняў, што ўносіла пэўную блытаніну, фарміравала шматлікую асіметрычную інфармацыю на кіраўніцкім узроўні. Назвы захоўваліся за губернямі ў афіцыйна-дзелавых інфармацыйных патоках да 1840 года[4]. Мінская губерня на працягу XIX стагоддзя доўгі час

---

[2] На наш погляд, пры пэўных верагоднасных абставінах гэты факт можна разглядаць і як выпадковы вынік.
[3] Вільня стала адзіным адміністрацыйна-кіраўніцкім і адукацыйным цэнтрам Паўночна-Заходняга краю толькі ў 1863 г.
[4] Указам Сената ад 18 ліпеня 1840 года афіцыйна неабходна было называць губерні ў адпаведнасці з адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформай Расійскай імперыі.

існавала як самастойная адміністрацыйная адзінка, без выразнай прыналежнасці да беларускай ці літоўскай зямлі, а ў адукацыйнай справе падпарадкоўвалася папячыцелю Віленскай навучальнай акругі.

На макраўзроўні ІС соцыуму маштабнае этнічнае размежаванне людзей было навацыйным феноменам XIX стагоддзя, не характэрным для XVIII стагоддзя. Гаварыць пра распаўсюджанасць на мікраўзроўні ІС этнакультурнай самасвядомасці людзей[5] у канцы XVIII – пачатку XIX стагоддзя нельга, бо гэта будзе асіметрычная інфармацыя, якая трымаецца на эфекце перагорнутага часу. У інфармацыйнай прасторы Паўночна-Заходняга краю першай паловы XIX стагоддзя адсутнічаюць факты, якія б пацвярджалі сацыяльную выгаду ці значнасць у структурах соцыуму паходжання чалавека, яго этнакультурнай прыналежнасці да пэўнага народа. Важнымі лічыліся еднасць з дзяржаўным утварэннем і ідэалогіяй, маёмасны статус чалавека, яго прыналежнасць да вышэйшага саслоўя незалежна ад месца нараджэння ці веравызнання. Соцыум яшчэ не структурыраваўся па этнічнай, нацыянальнай (у сучасным разуменні гэтага паняцця) ці культурнай прыналежнасці. Нават ва ўладзе Расійскай імперыі было вельмі шмат «іншаземцаў»[6], якія былі падданымі Расіі, самааддана служылі ёй.

У той жа час адзначым, што ў ІС краю адбываліся структурныя пераўтварэнні, якія цалкам мянялі аблічча яе ІП. Назіраўся працэс ліквідацыі шляхецтва як найбольш дзейснай, інтэлектуальнай і кіраўніцкай сацыякультурнай структуры мінулага, яму на змену паступова ішла першапачаткова не значная па колькасці армія чыноўнікаў. Адбывалася змена кіраўніцкай структуры традыцыйнага соцыуму і якасці яе галоўнага пласта – эліты. Як адзначалі беларускія гісторыкі, «розніца ў прававаым становішчы дваранства ў Расіі і Рэчы Паспалітай была вялікая ўвогуле. У Рэчы Паспалітай шляхта мела вялікія правы, а ўлада караля была занадта слабой… Дзейнасць вышэйшага заканадаўчага органа ў краіне – сейма – была паралізавана «залатымі шляхецкімі вольнасцямі» [5, с. 265]. У складзе Расійскай імперыі шляхта губляла свае правы, але чалавек высакароднага паходжання пры пацверджанні дакументамі свайго сацыяльнага статусу мог прысягнуць на вернасць расійскай кароне і перайсці ў дваранства, карыстацца ўсімі прывілеямі рускага двараніна магутнай дзяржавы. Толькі цяпер ужо «магнатам забаранялася мець уласнае войска, крэпасці і г.д.» [2, с. 192]. З сучаснага пункту гледжання назіраецца функцыянальнае і маральнае прыніжэнне эліты былога соцыуму. Аднак у кантэксце агульнаеўрапейскіх тэндэнцый пачатку XIX стагоддзя гэта звычайны інфармацыйны працэс, які адпавядаў дынаміцы сусветнай культуры.

Масавы пераход шляхты ў рускае дваранства адбываецца ва ўсіх губернях краю. На працягу амаль усёй першай паловы XIX стагоддзя такімі справамі займаюцца дваранскія думы ў Віцебску, Магілёве, Мінску, Вільні, Гродне. Паказальна, што значная частка спраў у гэты час вядзецца на польскай (не беларускай) мове, мясцовая эліта амаль не ведала рускай мовы, а некаторыя зусім не ўмелі пісаць, за іх гэта рабіў губернскі пісар. Наваствораным дваранам выдавалася «Diploma» ці своеасаблівая грамата, якая зацвярждала радавод. Напрыклад, справа № 10 фонду 2066 у НГАБ (Мінск) – гэта шматлікія рашэнні Магілёўскага губернскага дваранскага дэпутацкага схода па прыняцці ў рускае дваранства польскай шляхты з Копыскага[7], Мінскага, Быхаўскага, Магілёўскага, Аршанскага, Рагачоўскага, Чавускага, Віцебскага, Чэрыкаўскага, Сеннінскага, Клімавіцкага, Беліцкага[8] паветаў на 179 аркушах, пісаных у асноўным папольску ў 1802 – 1808 гадах [6].

Пасля далучэння да Расійскай імперыі беларускіх і літоўскіх зямель ІС Паўночна-Заходняга краю знаходзілася ў неўраўнаважаным стане па сацыяльна значных для жыццядзейнасці паказчыках, што было абумоўлена агульнай трансфармацыяй камунікацыйнай сістэмы, зменай кіраўніцкіх цэнтраў (з захаду на ўсход) і функцыянальнай структуры соцыуму. У першай палове XIX стагоддзя гэта была жорстка цэнтралізаваная інфармацыйна-камунікацыйная сістэма, якая значны час дзейнічала ва ўмовах ваеннага рэжыму, а «Белоруссія» і «Литва» з'яўляліся стратэгічнымі і геапалітычнымі рэгіёнамі, заходнім фарпостам Расійскай імперыі. У інфармацыйнай прасторы краю назіраліся *адваротныя агульнаімперскім тэндэнцыі*, якія вызначаем у супастаўленні:

- жорсткая цэнтралізацыя кіраўніцкай сістэмы ў краі і дэцэнтралізацыя інфармацыйна-камунікацыйнай функцыянальнай сістэмы ў імперыі ўвогуле;
- перавага інфармацыйных працэсаў гетэракаталізу ў краі і перавага інфармацыйных працэсаў аўтакаталізу ў імперыі.

**Заключэнне.** У XIX стагоддзі тэндэнцыі ў ІП Расійскай імперыі не мелі той жа якасці ў ІП Паўночна-Заходняга краю, таму нельга атаясамліваць самі ІС, дзе назіраліся самастойныя працэсы ўтварэння новых структур. Працэсы гетэракаталізу не толькі могуць, але і спрыяюць стварэнню адзіных інфармацыйных узроўняў як гомеастатычных сацыякультурных згуртаванняў у ІС соцыумаў. Іх нельга абмяжоўваць дзяр-

[5] Да этнакультурнай самасвядомасці мы не адносім рэлігійную ідэнтыфікацыю людзей.
[6] Напрыклад, іншыземцамі былі Кацярына ІІ, літоўскі ваенны губернатар Л.Л. Бенінгсен, вучоныя Акадэміі навук Расійскай імперыі і інш.
[7] Копыскі павет у 1861 г. перайменаваны ў Горацкі.
[8] Беліцкі павет у 1852 г. перайменаваны ў Гомельскі.

жаўнымі, палітычнымі, геаграфічнымі бар'ерамі, бо яны трымаюцца на інфармацыйнай прычыннасці, абумоўлены функцыянаваннем свайго інфармацыйнага ўзроўню і дынамікай ІС. Стварэнню адзіных сацыякультурных інфармацыйных узроўняў з уласнымі гомеастатычнымі працэсамі як забеспячэнне няспыннага працэсу *аўтакаталізу* ў рэгіёнах спрыялі ў XIX стагоддзі лакалізаваная дзейнасць генерал-губернатараў, узмацненне ролі губернскіх праўленняў, наяўнасць тапонімаў і ўласных імёнаў «Белоруссія» і «Литва». Апошнія выконвалі ролю атрактараў пры фарміраванні дысіпатыўных структур у незваротных працэсах самаарганізацыі ІС культуры.

*Асіметрычная інфармацыя* – з'ява дынамікі шматлікіх форм інфармацыі, яе выклікае прасторачасавая разарванасць асобных інфармацыйных працэсаў і наяўнасць розных ІС. На асіметрыі трымаецца *«эфект перагорнутага часу»*, калі чалавек ментальна ўспрымае мінулае як жорстка дэтэрмінаваныя сучаснасцю інфармацыйныя працэсы.

ЛІТАРАТУРА

1. Дыбковская, А. История Польши с древнейших времен до наших дней / А. Дыбковская, М. Жарына, Я. Жарын; под ред. А. Сухени-Грабовской и Э.Ц. Круля. – Варшава: Науч. изд-во ПВН, 1995. – 381 с.
2. Чигринов, П.Г. Очерки истории Беларуси / П.Г. Чигринов. – Минск: Выш. шк., 2000. – 461 с.
3. Винер, Н. Кибернетика, или Управление и связь в животном и машине / Н. Винер. – М.: Сов. радио, 1958. – 215 с.
4. Сарока, С.М. Фарміраванне інфармацыйнай прасторы беларуска-расійскіх міжрэгіянальных кантактаў у канцы XVIII – XIX стагоддзі / С.М. Сарока // Роднае слова. – 2011. – № 9. – С. 82 – 85.
5. Гісторыя Беларусі: вучэб. дапам. / Я.К. Новік [і інш.]. – Мінск: Універсітэцкае, 2000. – Ч. 1: Ад старажытных часоў да лютага 1917 г. – 416 с.
6. Решение Могилевского депутатского собрания о приеме в русское дворянство бывшей польской шляхты из поветов: Копысского, Минского, Быховского, Могилевского, Оршанского, Рогачевского, Чаусского, Витебского, Чериковского, Сенненского, Климовичского, Белицкого 1802 – 1808 гг. // Нац. гіст. архіў Беларусі, г. Мінск. – Фонд 2066. – Воп. 1. – Спр. 10. – 179 арк.

*Паступіў 23.04.2012*

**ASYMMETRICAL INFORMATION IN CULTURE OR AN EFFECT OF INVERTED TIME**

***S. SAROKA***

*An appearance of symmetrical and asymmetrical information in culturological researches is described; main factors and descriptions of abstract culture information systems are considered. For the first time in the article the author gives a proof of an adverse time effect as past information prosess determined by morden information systems. The principle idea put forward in the article is that asymmetrical information is a resalt of space-time incoherent of information systems. Information analysis is carried out through the example of XIX-th century Byelorussian culture as an abstract information system.*